УДК 398.3

***І.А. Швед***
*д-р філал. навук, праф., праф. каф. беларускага літаратуразнаўства*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: bellit@brsu.brest.by

# МІФАСЕМАНТЫКА І ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ ВОБРАЗА АРЛА Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ*

*Мэтай працы з'яўляецца вызначэнне міфасемантыкі і функцыянальнасці вобраза арла ў відах і жанрах беларускага фальклору. Гісторыка-генетычнае і функцыянальна-семантычнае даследаванне «тэксту арла» паказала, што ў ім дамінуе семантыка першынства, царскага статусу, усёведання, мужчынскасці і функцыянальнасць як знішчальніка старога і крэатара новага светаладу, а таксама трансгрэсара межаў паміж рознымі сферамі светабудовы. Арол выступае ў адным семантычным полі з такімі сакральна вылучанымі прадстаўнікамі жывёльнага свету, як змяя, рыба, конь, сокал, ястраб, воран, голуб (галубка), зязюля. Ён звязаны з засветамі, небам (хмарамі), Богам, царквой, дубам, яварам, морам, атрыбутаваны золатам.*

## Уводзіны

Арніталагічныя вобразы фальклору і іх міфалагічныя складнікі неаднойчы звярталі на сябе ўвагу даследчыкаў традыцыйнай культуры і фальклору. Іх найперш цікавіла сімволіка паасобных вобразаў у тэкстах фальклору. І толькі апошнім часам пачалі з'яўляцца даследаванні гэтых вобразаў менавіта як чыннікаў арніталагічнага кода традыцыйнай культуры пэўных народаў – найперш тут трэба назваць грунтоўную працу расійскага даследніка А. Гуры [1], зробленую на славянскім матэрыяле. У гэтай жа манаграфіі пададзена найбольш поўная бібліяграфія і гістарыяграфія пытання, да якой мы і адсылаем. Народным уяўленням славян пра птушак і жывёл, арніталагічным (шырэй – заалагічным) вобразам фальклору беларусаў і іншых народаў прысвечаны таксама працы беларускіх фалькларыстаў, міфолагаў, этнографаў, археолагаў, культуролагаў А. Боганевай, Т. Валодзінай, Ю. Драздова, Л. Дучыц, Э. Зайкоўскага, У. Лобача, А. Садоўскай, С. Санько, Л. Салавей, І. Швед, Ю. Янкоўскага, у прыватнасці, артыкулы ў энцыклапедычным слоўніку «Міфалогія беларусаў» [2]. Выяўленню асаблівасцей «семантыкі і функцыянавання арнітавобразаў у беларускім фальклоры ў кантэксце ўніверсальнасці і адметнасці іх у межах славянскай і індаеўрапейскай супольнасцей», «арнітамарфізму як суцэльнай структуры» ў сэнсе «архетыпічнага зместу» прысвечана дысертацыя М. Камаровай «Архетыпічнасць, асаблівасці семантыкі і функцыянавання арнітаморфных вобразаў-сімвалаў у беларускім фальклоры» [3].

Вобраз арла ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў займае важнае месца. Ён звязаны з разнастайнымі ўяўленнямі і выклікае даволі складаныя сімвалічныя асацыяцыі. Між тым гэты вобраз як чыннік арніталагічнага кода беларускага фальклору не быў прадметам спецыяльнага даследавання беларускіх і замежных вучоных, за выключэннем вельмі сціслага артыкула «Арол» М. Камаровай і Л. Салавей у энцыклапедычным слоўніку «Міфалогія беларусаў» [2].

Прапанаваная праца прысвечана гісторыка-генетычнаму і функцыянальна-семантычнаму даследаванню вобраза арла. Мэта працы – вызначыць міфасемантыку і функцыянальнасць арла як чынніка арніталагічнага кода беларускага фальклору.

*Прадстаўлены некаторыя вынікі навукова-даследчай працы «Зоологический код белорусской традиционной духовной культуры (по записям XIX – начала XXI в.)», якая выконваецца па ДПНД «Экономика и гуманитарное развитие белорусского общества» (№ дзяржрэгістрацыі 20160897 ад 13.04.2016).*

У беларускай народнай традыцыі арол *вызначаецца высокім сакральным статусам, надзелены царскімі і боскімі атрыбутамі, называецца «божай пташкай».* У казцы «Пціцы на Русі» да арла звяртаюцца не інакш як «бацюшка цар арол» і просяць «рассудзіць», «налажыць пічінню», пакараць «злодзеяў» [4, с. 218–220]. Паводле загадкі (з Магілёўскай губерні) пра хрышчэнне немаўляці, «пад дубам райскім, пад крыжам царскім два арлы арлуюць, адно яйцо балуюць» [1, с. 610].

Даўнія міфалагічныя карані, верагодна, мае баладны сюжэт «з забітага арла паўстае царква»: «Ой, за лесам, лесам, на круглам полі / Пагубляў малойчык вараныя коні. / Да пашоў малойчык вараных коней шукаць, / Не знайшоў коні вараненькіх, да [г]арла на дубе. / – Ой, ты, гарле, ты сядзіш высока, ты бачыш далёка, / Ой, чы ты бачыў маіх коней вараненькіх? / – Ой, не бачыў, не відзеў тваіх коней вараненькіх. / Ой, узяў малойчык у белыя ручкі стрэльбу, / Узяў стрэльбу да застрэліў гарла на дубе. / Дзе галоўка упала, там цэркаўка стала, / А дзе крыльца ўпалі, там аўтары сталі, // А дзе ножанькі упалі, там свечачкі сталі» [5, кн. 1. с. 447].

У сувязі з царскім статусам арла паказальным з’яўляецца вядомае паданне пра Ліздзейку, якога князь Гедымін знайшоў у арлінным гняздзе і якому наканавана было стаць вярхоўным крыве (жрацом) літоўцаў.

У структуралісцкай схеме трактоўкі Сусветнага дрэва ў якасці мадэлі свету, як вядома, птушкі рэгулярна асацыююцца з касмалагічным верхам, змеі, рыбы – з касмалагічным нізам, а чалавек, розныя звяры і свойскія жывёлы – з сярэдзінай. У абрадавых песнях, звязаных з навалеццем, арол з’яўляецца птушкай, якая *маркіруе касмалагічны верх, лакалізуецца ў кароне Сусветнага дрэва і вядзе рытуальны дыялог з «царом» ніза* – рыбай: «Ой над рэкаю, над глыбокаю, / Святы вечар, святы Васіллё. / Там стаяў явор, тонкі, высокі, / Тонкі, высокі, зверху кудравы. / На том яворцы орлічак сядзіць. / Орлічак сядзіць, у ваду глядзіць. / У ваду глядзіць і рыбку бачыць. / Ён рыбку бачыць, з рыбкай гаворыць: / – Ой ты, рыбачка, як ты глыбока, / Як ты глыбока, а я высока. / З цябе, рыбачка, смашная юшка, // А з мяне, арла, мякка падушка» [6, с. 142]. Сімвалічная карціна Сусветнага дрэва з арлом і рыбай выяўляе падкрэслена дынамічную мадэль жыццёвага цыкла Сусвету ад яго пачатку (касмагонія) і да канца, калі «цары» пэўных ярусаў светабудовы адмыслова прыносяцца самі сабе ў ахвяру, становяцца рытуальнай ежай. Тое ж характэрна і для іншых песень навалецця, прыкладам: «…І над рэчкою да над глыбокою / Там стоіць явор тонкой вусокой, / Ой, да ён стоіць й у воду гледзіць, / У воду гледзіць да з рыбкой говорыць: / – З цебе, рыбочка, смачная юшка. / – З цебе, орлічку, да м’якка падушка. / – Цебе, рыбочку, на тарэлочку. / – Цебе, орлічка, на гарэлочку» [7, кн. 1, с. 78].

Сувязь арла з ідэяй канца старога свету і пачаткам новага ўскосна выяўлена ў матыве «птушка дзяўбе часткі Сусветнага дрэва, абцярушвае з яго расу». У гэтым плане выключную цікавасць уяўляе валачобная песня, у якой арол адмыслова ініцыюе перастварэнне свету, склёўваючы шышачкі і абіваючы расу з высокага дуба ды гукаючы праўду: «А стаіць дубок, ён тонак, высок, / Вясна красна, зялёна! / Ён тонак, высок, лісцейкам шырок. / А на тым дубку да й сядзіць арол, / А й сядзіць арол, шышачкі клюець, / Шышачкі клюець, расу абіваіць, / Расу абіваіць, праўду гукаіць…» [8, с. 370].

Адмысловымі агенсамі «вечнага вяртання» (М. Эліадэ), узнаўлення часу арлы паўстаюць у загадцы пра год: «Дванаццаць арлоў, пяцьдзясят дзве галкі зняслі адно яйцо» [9, с. 51]. Як можна меркаваць з нагаданага тэксту, праз вобразы арлоў і галак мадэлююцца старажытныя ўяўленні пра час як пра цыкл, які вечна ўзнаўляецца, пра колавы, абарачальны час (згадаем уяўленне пра год як гняздо Брахмана). З ідэяй цыклізму, перыядычных пашкоджанняў і ўзнаўленняў арол звязаны ў замове «ад хвароб жывёл»: «На войстраві на Каяні бел камень ляжыць, на том камяні кедрава дрэва стаіць. Сокал прылятая – гняздо зьвівая, арол прылятая – гняздо збрасая» [10, с. 96]. У гэтай

замове арнітаморфны сакральны памочнік як бы раздвойваецца ў сваёй дзейнасці па выдаленні дэструктыўнай кампаненты з пашкоджанага свету (скідвае гняздо, якое, верагодна, асацыюецца з хваробай) і ўсталяванні новага светаладу, дзе няма месца немачы. Высакародныя драпежныя птушкі: арол і сокал – выступаюць адначасова саюзнікамі і апазітамі: рэпрэзентуюць разбуральна-знішчальны і стваральна-ўзнаўляльны аспекты. Практычна тую самую функцыю, што і ў замове, арол выконвае ў казцы «Пра Івана Дарагана», дзе арол са шчукай ды гончым сабакам дапамагаюць Івану Дарагану ўзнавіць характэрны для першачасоў ідэальны парадак, аднавіць парушаны Кашчэем свет. У казцы Іван Дараган рве з карэннем «аграмадны» дуб, а «пад тым дубам тры касых сажні ў зямлі сундук незгараемы, незгніваемы, а ў том сундуку заяц, а ў том зайцы вутка, а ў той вутцы яйцо», у якім знаходзіцца смерць Кашчэя Несмяротнага. Названым жывёльным персанажам-памочнікам застаецца разадраць зайца ды качку і дастаць яйка з мора, каб знішчыць Кашчэя ды ліквідаваць нястачу, якую ўчыніў Кашчэй Несмяротны «з пачатку света» – «багатыроў усіх пабіў, і валшэбнікаў усіх пагубіў, і ўкраў сонца, і месячка, і зорачкі, і стала цёмна людзям» [11, с. 66].

Гэтыя ж уяўленні пра *здольнасць арла да аднаўлення парушанага парадку, дэструкцыі ўвасаблення ліха і яго выдалення з чалавечага свету, да трансгрэсіі межаў паміж рознымі светамі, пра далучанасць яго да «чужога» свету* па-рознаму прадстаўлены ў замоўных матывах. Прычым, як і ў прыведзеных вышэй песнях навалецця і чарадзейнай казцы, арол у замовах можа лакатыўна звязвацца з сакральна вылучаным дрэвам, найперш, дубам. Так, у замове «ад крыксаў» з формулай «адсылкі» ў засветы (дзе падрыхтаваны добры прыём, пачастунак), арол сядзіць на дубе, а арліца з дзецьмі выяўляецца як антрапаморфны персанаж, якога намагаюцца задобрыць і пасылаюць у «найлепшы свет» у якасці пераносчыка крыксаў: «Першым разом, Божым указом. На горі дуб стоіть. На дубі орёл сыдыть. Пролетае орліца с малымі дітятамі. Святый Мыкола, да с этой деткі крыксы снымай да этой орліцы под крылы отдай, да пусть несут высоко і далёко – в толовые колоскі, в малёваны лужкі, в пуховы подушкы. Святы Мыкола, доступніца Хрыстова, Господі прыступы, поможы, да этой детке сон прынесы» (ФА*; Парахонск, Пінскі р-н). У іншай замове ад бяссоння арол не проста выносіць крыксы ў засветы, а дваццаць пяць арлоў прыносяць з Чорнага мора «сон ражджонаму, хрышчонаму» [12, с. 57].

Замовы ад хвароб жывёлы з формуламі немагчымасці абыгрываюць матыў заганнага дуба і такога ж арла на ім: «Первым разам, добрым часам. На сінім моры, на чыстым полі стаяў дуб без карэння, без карчэўя, без макушкі і без галля. І на етам дубі сядзеў арол без галавы, без касцей, без пер'я, без крылля. Як етаму арлу па свету не лятаць, разных пташак не пабіваць, так у етай скаціны, чорнай шарсьціны, чэмеры, патніцы, еляніцы і пералогу не бываць» [10, с. 96]. У іншай замове «заганная» прэцэдэнт-сітуацыя малюецца наступным чынам: арол звівае на дубе «кубло бяздоннае», «нясе яечка бязжоўтнае» і выводзіць «дзяцёнка бязвочнага і бязногага і бяскрылага» [10, с. 96]. Ці, наадварот, арлу прыпісваецца незвычайна вялікая колькасць вачэй і вушэй, што дазваляе яму «далёка відаць і слыхаць»: «На сінім моры стаіць дуб на дваццаць восем сукоў, на тым дубі сядзіць арол на дваццаць восем вачэй, на дваццаць восем вушэй – далёка відаець, далёка слыхаець…» [10, с. 96].

Царом засветаў і яго насельнікаў, які сядзіць на дубе і забірае немач з чалавечага свету, выяўляецца арол у замове «ад рожы»: «…Стаіць дуб, на тым дубе сядзіць арол. Арол, арол, арол, прымі мае слава. Твае когці залатыя, твае крылля дарагія, твае глаза залатыя, прымі, прымі, прымі рожу зялёную і ваду ключавую…» [10, с. 215] (на-

* *ФА – Фальклорна-этнаграфічны архіў студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Фалькларыстыка і краязнаўства» БрДУ імя А.С. Пушкіна*

гадаем, што эпітэт «залаты» ўказвае на асаблівы статус аб'екта як прыналежнага да сакральных персанажаў і ўсяго сакральнага свету). Ва ўладзе моцнага, велізарнага «арлішча» спачатку дэструктураваць немач (урокі), а потым разнесці яе: «Ляцела ярлішча цераз багнішча з гострым носам, з гострымі пазюрамі, з вялікімі крыламі. Гострым носам раздзяўбе, пазюрамі параздзірае, крыламі размахае і ўрокі разнясе» [12, с. 170].

У замове «ад ворагаў» арол выступае адначасова сакральным памочнікам, на якім перасоўваецца чалавек, і страшачым персанажам, які адпуджвае злога духа: «Госпаду Богу памалюся, / Прычыстай святой пакланюся, / Святому айцу Мікалаю, / Вялікаму цудатворцу. / Першым разам, першым часам, / Арлом еду, вужом паганяю, / Гадзюкай падпяражуся, / Ад усякага злога духа адвяжуся!» [12, с. 102].

У шчадроўцы міфалагізаваныя вобразы арлоў і сакалоў фігуруюць у аднесенай да навалецця ўзвышана-сакралізаванай карціне вырабу сарочкі: «У нашага пана двор гароджаны, / Добры вечар, шчодры Васілей! / Двор гароджаны, садам саджаны, / Добры вечар, шчодры Васілей! / А ў тым садзе хадзіла зверка, / Добры вечар, шчодры Васілей! / Гэта не зверка, маладая дзеўка, / Добры вечар, шчодры Васілей! / Шыла-пашыла шоўкам кашулю, / Добры вечар, шчодры Васілей! / Шчэй на падоле – бурыя арлы, / Добры вечар, шчодры Васілей! / А на рукавах – ясны сакалы, / Добры вечар, шчодры Васілей! / Бурыя арлы хочуць сядаці, / Добры вечар, шчодры Васілей! / Ясны сакалы хочуць ляцеці. / Добры вечар, шчодры Васілей!» [13, с. 132]. У гэтай песні, як і ў прыведзенай вышэй замове, дзе сокал звівае, а арол скідвае гняздо, гэтыя птушкі мысляцца як парныя і разам з тым проціпастаўленыя вобразы, утвараюць адзінае семантычнае поле, звязанае з уяўленнямі пра вечны кругабег жыцця і смерці, рэгулярнае цыклічнае ўзнаўленне светаладу.

У купальскіх і пятроўскіх песнях пра арла недвухсэнсоўна гаворыцца як пра *божую птушку, якае лётае вышэй нябёсаў, бывае ў Бога і ведае пра важныя падзеі, што адбываюцца ў нябесным свеце*: «Арол, божжа пташка, высока лятаіць, / Высока лятаіць, у бога бываіць, / У бога бываіць, усё ён знаіць, / Усё ён знаіць, што бог парабляіць, / Што бог парабляіць: сам бог піва варыць, / Сам бог піва варыць – сам бог сына жэніць, / Сам бог сына жэніць, / Ілля дачку ддаець, / Ілля дачку ддаець, сам бог у ра-дасці, / Сам бог у радасці, / А Ілля са смутасцю» [14, с. 315]. Паводле іншай песні, арол бачыць, што на вяселле не запрошаны распарадчык нябесных водаў і агню Ілля. Такое «нешанаванне» стае прычынай гневу Іллі, які «спускае» вельмі непажаданыя падчас уборкі ўраджаю хмары: «Арол, божжа пташка, вышай неба лятаў, / Відзіў, што бог робіць – аж бог сына жэніць. / Усіх святых спрасіў, на дну Іллю забыў. / Ілля надзівіла – тры тучы спусціла: / Адну градавую, другу дажджавую, / Другу дажджавую, трэццю снегавую» [14, с. 316]. І калі ў такіх сюжэтах арол малюецца не агенсам, а простым назіральнікам за тым, што робіцца ў нябёсах (птушка толькі ведае, чаму насылаюцца хмары, але непасрэдна яе сувязь з хмарамі не выяўляецца), то ў песнях з сюжэтам «арол – памочнік малойца» арол абяцае дзейную дапамогу герою ў форме абароны ад «тучы-хмары». Так, жаніх хоча забіць арла, але «арол яму прамаўляя: / – Не страляй у мяне, маладый малойчык, / Як будзеш ты да жоначку меці, / Да й наступіць туча-хмара, / Туча-хмара, дробяны дождзык, / Спушчу крыло, сізо пяро / Да й накрыю цябе, маладога, / Цябе, маладога, з дружынаю, / З дружынаю, зь дзеўчынаю» [7, кн. 1, с. 149]. Ці ў іншай песні: «Стаяў явар тонкі, высокі, / Шчодры вечар добрым людзям! / Тонкі, высокі, на лісьце шырокі, / А пад яварам да й услончычак, / На слончыку малады малодчык, / Малады малодчык лук напіная, / Лук напіная, у арла страляя. / Арол яму прамаўляя: / – Не страляй у мяне, малады малодчык, / Як будзеш ты да жаніцісь, / Я ў цябе буду ў вялікай прыгодзе, / Як будзеш ты да жоначку весьці, / Да й наступіць чорна хмара, / Туча-хмара, дробен дождзык, / Да й пакрыю цябе маладога, / Цябе маладога з дружынаю, / З дружынаю, з дзяўчынаю» [7, кн. 1, с. 82].

У іншых песнях арол прылятае з-пад чорнай хмары, прыкладам, у песні на любоўна-шлюбную тэматыку: «Прыляцеў арол з-пад цёмнае хмары, / Забіў галубка з любімае пары» [15, с. 150].

Непасрэдна *сувязь арла з нябеснымі стыхіямі*, паназіраннях А. Гуры, выяўляецца ў паўднёваславянскіх матэрыялах. У балгар, сербаў пашырана павер’е, што арол узначальвае градавыя хмары; радопскія балгары лічаць, што такія хмары вядзе двухгаловы арол, разам з тым верацъ, што арол змагаецца з хмарай, адводзіць яе ад палёў і ратуе ўраджай. Таму, паводле балгарскіх уяўленняў, нельга забіваць арла і бурыць ягонае гняздо, а парушальніку гэтай забароны пагражае страшная кара – хваробы, няшчасці ў сям’і. У замове арол кідае грамавую стралу ў сырую зямлю. Балгары вераць таксама, што арол здатны наведваць нябёсы і спускацца ў падземны свет [1, с. 611]. У беларускай загадцы хмара выяўляецца праз вобраз арліцы: «Ляціць хмара па сіняму небу, крылы распластала, сонца заслала» [9, с. 39].

Не толькі сувязь з нябёсамі (хмарамі), але і здольнасць арла да трансгрэсіі межаў паміж рознымі светамі робіць яго прыдатным да ролі *чароўнага памочніка жаніха* ва ўзгаданых і іншых калядных і валачобных песнях. Найзамен на жыццё арол (замест яго могуць фігураваць сокал, змяя або турак) абяцае арганізаваць рытуальны «пераход» праз рэкі, шырокія мары, крутыя горы жаніху, нявесце і ўсім вясельнікам, пры гэтым вобраз арла (сізага, чорнага, бурага, як лісіца) гіпербалізуецца: «Ай, у пана Сямёна, да на яго дварэ, / Шчодры вечар да й добрым людзям! / Там стаяў явар тонкі і высокі, / На тым явары да сядзелі арлы. / Выйшаў Іван да арлоў страляці. / Тыя арлы да й прамовілі: / – Малады Іванка, да не бі арлоў, / Да як будзеш да жаніціся, / Да не будзе табе перавозу. / Прыедзеш ты к ціхаму Дунаю, / Тваю дзевачку / Хіму добра знаю, / Пасаджу цябе на правым крыле, / Тваю дзевачку Хімачку да й каля цябе, / А твой поезд на левым крыле, / Тваіх музыкантаў на сізым хвасце» [6, с. 308]. Пры гэтым у арла-«пераносчыка» вылучаюцца шыя, спіна, крылы (на іх размяшчаюцца маладыя), хвост («для сваточкаў», музыкаў). Арол можа не толькі на сабе пераносіць усіх вясельнікаў, але і перавозіць іх на новых чаўночках, а «конікаў ўплаў пушчае», «сабакаў усіх перасвішчвае» [8, с. 372]. «Існуе сюжэт балады пра заклад арла с канём: не адолеўшы каня, арол падае з неба на зямлю. Відавочна, што ва ўсіх выпадках арол – сакральна вылучаная птушка, яна прыраўноўваецца да чалавека, каня, змяі – істотаў, якія займаюць важнае месца ў сакральнай герархіі». У казцы майстар робіць драўлянага арла, царэвіч лётае на ім у вежу да царэўны; яго ловяць і хочуць пакараць смерцю; з месца пакарання адлятае з царэўнаю [2, с. 25].

У некаторых узорах народных песень карціна непасрэднай помачы з боку арла ў пераадоленні маладымі небяспечных межаў не малюецца – малойцу проста прапануецца замест таго, каб страляць арлоў, узяць сацыяльна прэстыжны шлюб: «У пана Івана явар на дварэ, / Святы вечар! / Вышаў Іван арлоў страляць. / – Не страляй арлоў, едзь да каралёў, / Дасць табе кароль варана каня, / Каралеўна – з-пад залот персцень» [6, с. 306]; «Малады Іванка вокны вымае, / Вокны вымае, арла страляе, / Святы вечар! / – Не страляй ты арла, / Едзь да караля. / Дасць табе кароль / Варанога каня, / Варанога каня / І хустку з-пад злота, / І хустку з-пад злота, / І персцень на руку» [6, с. 307]. І нарэшце, суаднясенне песенных падзей любоўна-шлюбнага характару з вобразам арла надае ім нейкую асаблівую вызначанасць, эстэтычную афарбоўку, фармалізуецца – адпаведна вобраз арла фігуруе ў канструкцыях з фармальным паралелізмам тыпу: «Высака арол ляцеў, / Далі мне, каго я хацеў, / Тонкую, высокую, / Крэпка недалёкую» [16, с. 150]. Але ў святле вышэй адзначанай сімволікі арла, функцыянавання яго як медыятара і сакральнага памочніка такі паралелізм толькі па форме, але не па змесце можа трактавацца як штучны. У лірычных песнях пазнейшага паходжання да арла звяртаюцца з просьбай занесці туды, дзе знаходзіцца хлопец, які «жэнытіся думая», як у «мужчын-

скай» песні: «Ой ты, орло, сізокрэлы, / Ты вісоко лэтаеш, / Возьмы мэнэ на крылэчко, / Да й занэсы, куда знаеш. / Занэсы, мой ты орла, / Да й на сынэе морэ, / Бо на том сынэм морэ / Лэжыць камэнь на бэрожку. / А на тому команачку / Сэдыть козак молоданькы, / І дэнь жэ він он думая, / Ой, жэнытіся думая. / – Ой осудэ міні Божэ, / Тую дівчіну взятэ, / Што батькам нэ до сподобэ, / А до міні до сподобэ» [17, кн. 1, с. 230–231].

*Медыятыўная функцыянальнасць арла і звязанае з ёю ўсёведанне* паэтычна прадстаўлены ў сталых песенных зваротах да птушкі з запытаннямі тыпу: «Ты высока лятаеш, можа, ведаеш…». У баладзе ўдава размаўляе з арлом, які сядзіць на явары: «Каля рэчкі Дняпра / Там хадзіла ўдава, / Там хадзіла ўдава. / Там забачыла яна / На явары арла. / – Ой ты, арол, мой арол, / Да ты чорны, як варон, / Ты высока лятаеш / І далёка пазіраеш. / А ці не відзеў ты, арол, / Майго мілага дружка? / – Ох, твой міленькі дружок / Ён з туркамі ваюе, / Ён з туркамі ваюе / Па каленачкі ў крыве / Ды й па шапачкі ў трупе. / А на яму рубашоначка / Ўся ўскіпела у крыве. / – Ой ты, арол, мой арол, / Ох ты, чорны варон, / Ты высока лятаеш / І далёка пазіраеш. / Прынясі-ка ты, арол, / Мне рубашачку ад яго…» [5, с. 78–79]. Несуцяшальным адказ арла на пытанне аб пакінуўшым родны кут чалавеку з'яўляецца і ў іншых тэкстах, прыкладам: «Ныско колос похылывся, / Ныско колос похылывся. / Сын матэры поклонывся: / – А дай на войноньку іду, / Жды мэнэ, матко, молодого, / Як коныка вороного. / Шо ж ій вісточкі од его / Тры года маты ждала, / А дай плакаты стала: / – Нема мого сынка молодого, / Як коныка вороного. / Летыть орол з чужых сторон, / Дай пытаты стала: / – Можэ, ты орол, высоко летаеш, / Можэ, ты мойго сынка ведаеш? / – Ой я, матко, ныско лэтаю, / Твоего сынка шчо дэнь выдаю – / Краснэ мясо выбыраю, / Білы косты й оставляю» (ФА; Лышчыцы, Брэсцкі р-н). Акрамя лучнасці арла з «чужым» светам у такіх кантэкстах выразна прадстаўлены яго драпежніцкі, злавесны характар, вяшчунская функцыя і сімволіка смерці. Гэта збліжае вобразы арла і ворана, матывуе ўзнікненне такой формы звароту да весніка смерці, як «ой ты, арол, мой арол, ох ты, чорны варон». У вераваннях, народных тлумачэннях сноў арол таксама надзелены функцыяй транслятара ў свет людзей недаступнай для іх інфармацыі, у тым ліку пра смерць: «Арол ці птах які прыляціць – то ведамасць» [18, с. 431]; «Арла бычыць – атрымаеш пісьмо пра смерць кагосьці» [18, с. 431].

У шэрагу тэкстаў выразна прадстаўлена *мужчынская сімволіка арла,* прыкладам, у тлумачэнні сну: «Як бярэменнай прысніцца арол – сын будзе» [18, с. 431]. У асобных песнях арлом называюць малойца, казака, пару яму можа складаць такая «жаночая» птушка, як галка: «…Дзяўчына, дзяўчына, ты – чарненька галка, / Дзе я пахілюся, мне – друга каханка, / Дзе я пахілюся, мне – друга каханка. / – Казача, казача, ты сівенькі орлік, / Хто ж цябе без мяне да сябе прыгорне?» [15, с. 214]. Такія «арніталагічныя» назовы з'яўляюцца спосабамі ўзвелічэння лірычных герояў.

*Мужчынская сіла, рашучасць, імклівасць, нечаканасць нападу «з вялікага палёту»* абыгрываюцца ў сімвалічных карцінах арла, які разбівае стаю і хапае «жаночую» птушку (дзяўчыну). Прыкладам, падчас «ваджэння і пахавання стралы» на Ушэсце спявалі: «…Што на тых на гусачак налятаў сізай арёл, / Налятаў сізай арёл з вялікага поляту. / Ухапіў ён гуску, гуску за галоўку, / Гуску за галоўку, за белаю шэйку, / За белаю шэйку, за правае крыльца…» [7, кн. 2, с. 766]; «Ўдоль па мору, / Ўдоль па мору, мору сінему. У! / Плыла стая, / Плыла стая лебядзіная. У! / А за ёю, / А зя ёю сакаліная. У! / Адкуль ўзяўся, / Адкуль ўзяўся сізакрылы арол. У! / Разбіў стаю, / Разбіў стаю лебедзіную...» [7, кн. 2, с. 766]; «А на том на возеры жы серы гусі плавалі, / Паміж гэтых гусачак – белая ляб'ёдачка. / Ох, наляцеў, наляцеў сіз арол на крылушках, / Сіз арол на крылушках, у залатых перушках. / Ой, разагнаў, разагнаў гусачак па возеру, / Ой, ухапіў, ухапіў лябёдку за крылушкі…» [7, кн. 1, с. 272].

У баладах арол разбівае пару закаханых (галубоў), ударае «галубка ў сізыя плечы», а сам ляціць «пад аблокі», а «за ім галубка, расплакаўшыся»; арол абяцае ёй нагнаць узамен цэлую стаю галубоў [5, кн. 2, с. 586]. У іншай баладзе арол «забівае галубца з правага крыльца», забірае галубку-«ўдавіцу» ў «няволеньку», корміць яе пшаніцай, поіць вадой з крыніцы [5, кн. 2, с. 589].

У песнях з матрыманіяльнымі матывамі *арлы сімвалічна асацыююцца са сваякамі жаніха, яго ваяўнічай дружынай.* Сказанае можна праілюстраваць узорамі каляндарна-абрадавых песень: «Чаму, барок, ды не званок? / – А як мне, барку, быць званку, / Калі ў мяне пташак няма? / Адна была зязюлечка, / Адна была шэранькая, / І тую арлы забралі / І ястрабам аддалі. / – Чаму, дварок, не мяцён? / А як мне мяцёным быць, / Калі ў мяне дзевак няма? / Адна была Ніначка, / Адна была малада, / І тую сваты забралі: / Таму-сяму – на муку, / А Генечку – да веку» [14, с. 323]; «…Што былі пташачкі, усе ў вырай паляцелі, / Ой, гаю, гаю, у вырай паляцелі. / А адна пташачка ды й прызустала, / Ой, гаю, гаю, ды й прызустала. / Да й тую хочуць арлове узяць, / Ой, гаю, гаю, арлове узяць. / Арлове узяць, сакалам аддаць, / Ой, гаю, гаю, сакалам аддаць. / Арлам на рукі, сакалам навекі…» [13, с. 262].

Важнай матывальнай прыкметай арла ў такіх кантэкстах стае драпежніцтва – адпаведна арлы дзяруць сваю ахвяру (зязюлю), яна ім патрэбная на мяса, што сімвалічна карэлюе з ідэяй прымусовага пераводу нявесты-зязюлі (аб'екта) у іншы стан, іншую сацыяльна-біялагічную катэгорыю: «…Адна й была зязюля, / Тую арлы задралі. / Арлам яна й на мяса, / А й сокалу на пер'я…» [13, с. 185]. Негатыўную канатацыю вобраз арлоў можа набываць у параўнаннях, як у восеньскай песні, дзе «грабцы грабуць, як арлы равуць», везучы ў мора няшчасную замужніцу [19, с. 241].

У вусна-паэтычных творах з сюжэтам «Птушынае вяселле» арол захоўвае сваю мужчынскую сімволіку і функцыю актыўнага дзеяча: ён павінен збіраць на пагулянку ўсё птаства, малоць муку [20, с. 260–261] ці выконваць ролю капітана: «…Сабіраліся, саджаліся / Бальшэе члены к саве на свадзьбу: / Жораў – маёрам, / Арол – капітанам» [20, с. 239]. Між тым драпежніцкі характар арла не дазваляе яму выконваць прызначаную ролю на пагулянцы, замест таго, каб запрашаць гасцей на вяселле, ён выяўляе ў дачыненні да іх агрэсію, пачынае «мардаваці»: «Шчыглік невялікі… / Паслаў арла, паслаў арла / Ўсё птаства збіраці, / А арол напаў на гусі, / Давай мардаваці…» [20, с. 262].

І напрыканцы заключная заўвага адносна прадстаўленасці разгляданага арніта-вобраза ў матыве метамарфоз. Акрамя прыведзенай вышэй песні пра паўстанне царквы з забітага арла (з адпаведным паралелізмам частак цела птушкі і царквы), у нашым распараджэнні маюцца тэксты балад, у якіх у паэтычнай форме абыгрываецца матыў метамарфозы маладой замужніцы ў арліцу: «Ой, даўно-даўно я ў роду была! / Ужо тая сцежэнька дзярном зарасла… / Ой, як я захачу, дзярно патачу / І да свайго баценькі арлом залячу. / Ой, не так арлом, як арліцаю…» [15, с. 239] (вобраз арліцы тут перакрыжоўваецца з вобразам зязюлі, у якую найчасцей скідваецца маладзіца). У іншым сюжэце «мужчынскую» пару арліцы складае сокал-муж: «…Дзесь паехаў мілы на мора гуляць, / А мяне пакінуў у доме гараваць. // Ой, я ў сваёй мамкі ды й даўно была, // Ужо ж тая дарожка дзёрнам зарасла. // Ой, не так жа дзёрнам, як дзярніцаю, // Ён зрабіўся сокалам, я – арліцаю. // А ўзляцеўшы сокалам, я – арліцаю, // Ён зрабіўся месяцам, я – зарніцаю» [5, кн. 1, с. 404].

**Заключэнне**

Падсумоўваючы назіранні пра міфасемантыку і функцыянальнасць вобраза арла ў беларускім фальклоры, падкрэслім, што ў касмалагічных матывах арол звязаны з Сусветным дрэвам і рэалізуе асацыяцыі з ідэямі «вечнага вяртання», канца старога свету (смерцю) і пачатку новага (жыццём), абарачальнасці часу, рэгулярнай узнаўляльнасці

жыцця, а таксама выконвае функцыю сувязного паміж рознымі сферамі светабудовы, рэгулюе ўзаемаадносіны паміж пэўнымі яе чыннікамі. Далучанасць да касмічнага верху, вышняга, боскага свету і разам з тым да касмічнага нізу, засветаў, антысвету, здольнасць перасоўвацца паміж гэтым і іншымі светамі матывуе ролю арла як чароўнага памочніка-трансгрэсара ў казках, замовах, валачобных і калядных песнях. Гэтымі ж абставінамі тлумачыцца выразная прадстаўленасць у «тэксце арла» семантыкі ўсёведання, першынства, царскага статусу. Усведамленне сакральнасці арла, яго высокага статусу падкрэсліваецца праз суаднесенасць птушкі з Богам, небам (хмарамі), царквой, дубам, яварам, кедрам, морам, золатам і іншымі аб'ектамі, канцэптуальна скарэляванымі з нечалавечым, «чужым», цудоўным, сакральным. Арол выступае ўстойлівым вобразам малойца, мужчыны. Агрэсіўны, крыважэрны, злавесны характар, вяшчунская функцыя і сімволіка смерці, прыпісаныя арлу, аб'яноўваюць яго ў адно семантычнае поле з воранам. Ва ўзвышана-сакралізаваных кантэкстах арол можа ўтвараць персанажнае адзінства з сокалам – абедзве драпежныя птушкі характарызуюцца як высакародныя; параўнанне малойца з імі выступае адзнакай яго найвышэйшых якасцяў. У сюжэтах «вечнага вяртання» арол можа мысліцца як парны і адначасова проціпастаўлены сокалу вобраз.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Гура, А. В. Символика животных в славянской народной традиции / А. В. Гура. – М. : Индрик, 1997. – 912 с.
2. Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.
3. Камарова, М. А. Архетыпічнасць, асаблівасці семантыкі і функцыянавання арнітаморфных вобразаў-сімвалаў у беларускім фальклоры : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.09 / М. А. Камарова ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – 20 с.
4. Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі / склад. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 496 с.
5. Балады : у 2 кн. / уклад. Л. М. Салавей, Т. А. Дубкова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977–1978. – 2 кн.
6. Зімовыя песні: Калядкі і шчадроўкі / уклад. А. І. Гурскага, З. Я. Мажэйкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 736 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2001–2013. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. – Кн. 1. – 2012. – 910 с.
8. Валачобныя песні / склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, В. І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
9. Загадкі / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 368 с.
10. Замовы / уклад. Г. А. Барташэвіч. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 597 с.
11. Чарадзейныя казкі : у 2 ч. / склад. К. П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – Ч. 1. – 648 с.
12. Замовы / уклад. У. А. Васілевіч, Л. М. Салавей. – Мінск : Беларусь, 2009. – 519 с.
13. Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад. А. С. Ліса, народ. каляндар падрыхт. У. А. Васілевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 612 с.
14. Купальскія і пятроўскія песні / уклад. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіч, Г. В. Таўлай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 631 с.

15. Песні Беласточчыны / уклад. М. Гайдук ; гал. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 367 с.

16. Жаніцьба Цярэшкі / уклад. Л. М. Салавей, І. Д. Назінай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 519 с.

17. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2001–2013. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн. – Кн. 1. – 2008. – 559 с.

18. Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер'і : у 3 кн. / уклад. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996–1999. – Кн. 3. – 1999. – 654 с.

19. Восеньскія і талочныя песні / склад. А. С. Ліс, С. Т. Асташэвіч, В. І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 678 с.

20. Дзіцячы фальклор / склад. Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 03.02.2017

***Shved I.A.*** **Myth Semantics and Functionality of the Image of Eagle in the Belarusian Folklore**

*The aim is to define the mythsemantics and functionality of the image of eagle in the types and genres of Belarusian folklore. Historical-genetic and functional-semantic research of «text eagle» showed that of the semantics of the championship, the king's status, omniscience, the male principle dominate in Belarusian folklore. Eagle operates as a destroyer of the old and the creator of a new order. He is also the liaison between the various spheres of the universe. Eagle serves as the general semantic field of sacred animals such as the snake, the fish, horse, hawk, falcon, crow, pigeon (dove) and cuckoo. It is associated with the other world, the sky (clouds), God, the church, oak, sycamore, the sea, and endowed with the attributes of gold.*